Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (662) Пятніца, 31 сакавіка 1967 года. Год выд. XX. Цана 2 кап.







## ВІНШУЕМ, ЖАДАЕМ НОВЫХ ПОСПЕХАЎ!

### УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР АБ ПРЫСВАЕННІ ТАВ. СЕЎЧАНКУ А. Н. ГАНАРОВАГА ЗВАННЯ ЗАСЛУЖАНАГА ДЗЕЯЧА НАВУКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

**За заслугі ў развіцці навукі і падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў прысвоіць рэктару Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, акадэміку Акадэміі навук Беларускай ССР тав. Сеўчанку Антону Нікіфаравічу ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР.**

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
В. КАЗЛОЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Д. ЛУКАШЭВІЧ.**

## СЯБРЫ ЗАЎЖДЫ ПОБАЧ

Месяц назад Савет дружбы універсітэта разгледзеў пытанне аб дапамозе ў вучобе савецкіх студэнтаў біялагічнага, матэматычнага, хімічнага і фізічнага факультэтаў. На наш зварот адгукнуліся усе. Знайшлося шмат студэнтаў-камсамольцаў, якія з задавальненнем успрынялі нашу просьбу.

Будучаму ўрачу в'етнамскай студэнтцы Нго Тхі Ба дапамагае авалодаць біялогіяй студэнтка II курса біялагічнага факультэта Ася Міркіна. Наташа Аттас займаецца па біялогіі з будучым урачом Іхерджарыка Кевінам, студэнтам з Нігерыі. А студэнту з Конга (Браззавіль), будучаму ветэрынару Жану Дзіанкуіка дапамагае па біялогіі Галя Цвірко.

Шмат працуе з замежнымі сябрамі студэнтаў з іншых факультэтаў. Па матэматыцы занятнкі з нігерыйскім студэнтам Ефием Окан Эдзенам праводзіць Гена Мацвееў, з Генры Окойя працуе Аляксандр Леонаў. Ларыса Зайцава дапамагае па матэматыцы адразу двум — Кафару Адзедзе і Дзям'яму Чуксу Асуджы.

Аб усіх савецкіх сябрах нельга напісаць у адным артыкуле. Зазначу, што некаторым з іх удзячны не толькі асобныя студэнты, а цэлыя акадэмічныя групы. Гэта студэнты, якім лёгка даецца матэматыка і хімія, і якія яшчэ глыбей хочуць авалодаць гэтымі навукамі.

У акадэмічных групах праводзяць дадатковыя занятнкі па хіміі Тамара Марцэлева, Галіна Швец і іншыя. Усе замежныя студэнты вельмі удзячны савецкім сябрам за брацкую дапамогу. Можна не сумнявацца, калі студэнты падрыхтоўчага факультэта сур'ёзна выкарыстаюць гэтую значную дапамогу сваіх сяброў, то поспехі ў вучобе да іх абавязкова прыйдуць.

**Марсель КУЛУНАМІ,
член Савета дружбы універсітэта.**

## *У фотааб'ектыве~жыццё універсітэта*

*Кожную раніцу тысячы юнакоў і дзяўчат з розных куткоў Беларусі, другіх рэспублік і нават з замежных краін запаўняюць шматлікія універсітэцкія аўдыторыі. Наш ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэт стаў па-сапраўднаму інтэрнацыянальным, ён адыгрывае вялікую ролю ў падрыхтоўцы кадраў высокай кваліфікацыі. Асабліва мнагалюдна штодзённа ў светлым і прасторным корпусе (здымак уверсе). Тут займаюцца гісторыкі і філосафы, юрысты, матэматыкі і фізікі.*

*Хутка расце аддзяленне журналістыкі. Па сутнасці гэта цэлы факультэт. На другім здымку адзін з яго прадстаўнікоў, студэнт другога курса Міхаіл Рудкоўскі, які ўжо зарэкамендаваў сябе здольным карэспандэнтам.*

*А ў лабараторыях біяфака (здымак унізе) праца студэнтаў зацягваецца да позняга вечара. Вось і сёння чацвёртакурсніцы Наташа Кузаўкова і Тамара Семяніхіна захапіліся вопытам па мікрабіялогіі.*

*Фота А. Кадзета і У. Аскіркі.*

# ПІСЬМО АД СЫНА

Заходжу неяк у студэнцкі інтэрнат нашага універсітэта па вуліцы Кастрычніцкай. І раптам бачу: наш камендант Марыя Іванаўна, пажылая ўжо жанчына, чытае нейкі ліст і плача...

— Што з вамі, Марыя Іванаўна, — цікаўлюся...

— Ды вось, разумееце, радасць якая: атрымала пісьмо ад нашага Мао. Гэта — в'етнамец, — працягвае яна.—Жыў у нас, закончыў наш універсітэт, а цяпер дома, працуе, і вось першае ад яго пісьмо. Паслухайце толькі, што ён піша...

Мы разам з ёй трымаем ліст, ад чытання якога паяўляюцца слёзы радасці не толькі ў пажылой жанчыны. Вакол нас сабралася група студэнтаў, і ўсе з вялікім хваляваннем слухаюць далёкі голас з гераічнага В'етнама. Марыя Іванаўна амаль кожны радок пісьма каментыруе сваімі цёплымі ўспамінамі...

— А як мы іх праводзілі, калі Мао і яго таварышы ад'язджалі ў В'етнам, — зазначае яна. — Я спякла ім на дарогу вялікі каравай хлеба, з нашай беларускай пшаніцы. Хай памятаюць, — заключае яна, —што мы заўсёды страчаем і праводзім сваіх дарагіх сяброў з хлебам і соллю...

І я не стрымаўся, папрасіў гэтае пісьмо ў Марыі Іванаўны, каб яе радасць маглі падзяліць усе студэнты, аспіранты, прафесарска-выкладчыцкі калектыў нашага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Я не каментырую пісьмо. Яно гаворыць само за сябе. Хочацца толькі сказаць: «Хай заўсёды гартуецца і мацнее нашае сяброўства!»

З дазволу Марыі Іванаўны пісьмо друкуем без змен, не ўлічваючы толькі, што мы даём яго перакладзеным з рускай на беларускую мову.

**Анатоль КРУГЛОЎ,
аспірант.**

* * *

**ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ПАВАЖАНАЯ МАРЫЯ ІВАНАЎНА!** Толькі сёння я змог напісаць Вам ліст. Перш за ўсё ад імя нашых таварышаў жадаю Вам добрага здароўя, самага вялікага шчасця і шматгадовага жыцця!

Ад нашых мам перадаю Вам самае сардэчнае прывітанне і самыя добрыя пажаданні. Усе мы шчасліва заехалі дадому. Некаторыя з нас яшчэ будуць адпачываць, а я ўжо прыехаў на працу ў Ханой.

Хоць ужо некалькі разоў амерыканцы бамбілі Ханой, горад застаецца цэлым і моцным. Ханой змагаецца так гераічна, як і вашы гарады ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Абарона нашай Радзімы за яднанне, незалежнасць і свабоду з'яўляецца неад'емнай і першачарговай задачай кожнага з нас.

Мы жывём ужо далёка ад савецкага народа, ад савецкіх мам, але ў нашых сэрцах назаўсёды захавалася светлая памяць аб Беларускім універсітэце і савецкіх людзях. Наш народ добра ведае, што савецкія людзі — гэта нашы верныя браты як у радасці, так і ў бядзе.

Мы заўсёды высока ацэньвалі і будзем ацэньваь бескарыслівую дапамогу савецкага народа братняму В'етнаму, які змагаецца за ліквідаванне каланіяльнага гнёту.

Пасля месячнага адпачынку мы старанна працуем на вытворчасці. Сваімі ведамі, якія мы атрымалі ў Савецкім Саюзе, мы дапамагаем свайму народу ў барацьбе супраць амерыканскіх агрэсараў, а таксама ў пабудове сацыялізма.

Глыбока пераканаы ў тым, што наша краіна будзе аб'яднана. Магчыма, я зноў убачу Вас.

Яшчэ раз жадаю Вам многа і многа шчасця і вялікіх поспехаў у плённым выхаванні маладшага пакалення — студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Мы заўсёды былі і будзем удзячны Вам.

Прашу Вас, Марыя Іванаўна, перадаць нашы самыя шчырыя пажаданні Любові Міхайлаўне, што выдавала нам бялізну, студсавету, усім работнікам і студэнтам, якія жывуць ў нашым інтэрнаце.

Прашу Вас перадаць самыя братнія прывітанні Тані — Вашай дачцы.

Вашы в'етнамскія сыны і дочкі. Ханой.

ДО ВАН МАО.

**«ПАНЯЦЦЕ КУЛЬТУРЫ ВЕЛЬМІ ШЫРОКАЕ—АД МЫЦЦЯ ТВАРУ ДА АПОШНІХ ВЫШЫНЬ ЧАЛАВЕЧАЙ ДУМКІ»**

*М. І. Калінін*

# ПА ТОЙ БОК ЛЕКЦЫІ

*Ідзе праверка. Чытаюцца прозвішчы:*

*— Судакоў!*

*— Ёсць!*

*— Ляўкова!*

*Маўчанне... Там, дзе павінна сядзець Шмыга —пустое месца. Хтосьці з палёгкаю ўздыхае: «Добра, што хоць сёння прыйшоў».*

*Праверка закончана. З двух груп адсутнічае дзесяць чалавек, але гэта яшчэ не шмат: бывае і больш.*

*Студэнтам, якія прысутнічаюць на занятках, непрыемна за сваіх калег, непрыемна перад выкладчыкам, але што зробіш. Мабыць, патрэбна сабраць сход групы і пагутарыць з тымі, хто прапускае заняткі, — гаворыць адзін з іх. Нарэшце пасля другога перапынку прыходзяць прагульшчыкі. А той, хто гаварыў гэта, сам непрыкметна знікае. Чаму так атрымліваецца? Відаць таму, што ёсць «добрыя» старасты, якія не адзначаюць пропускаў у сваіх журналах. Гэта так. Безумоўна, у даным выпадку гутарка не ідзе аб прагулах па ўважлівых прычынах. Тут справа зусім іншая.*

*Некаторым студэнтам не хапае часу для таго, каб выспацца. А калі ён не спаў, то лепш не ісці на лекцыі, таму што там усё роўна будзе «клявапь» і яшчэ схіляць на іншых.*

*Ёсць другая катэгорыя студэнтаў - прагульшчыкаў. Гэтыя могуць прыйсці на лекцыю... першую, потым...*

*— Вось і адвучыліся сёння, — гаворыць дзяўчына сваёй сяброўцы.*

*— А цяпер?..—пытаецца сяброўка.*

*— У кіно.*

*— А семінарскія? Ты ж той раз аднеквалася.*

*— Скажы, што я хворая.*

*— Ну, добра. Толькі хутчэй збірайся, каб ніхто не заўважыў.*

*Гэтая гутарка характэрна адлюстроўвае паводзіны і наогул, рысы чалавека. Тут ужо можна самому рабіць вывад. Але дзіўным здаецца, чаму да гэтага часу не прынята ніякіх захадаў да падобных студэнтаў. Колькі можна з імі «ліберальнічаць».*

*Такіх на факультэце мала, але яны кладуць вялікую пляму на ўвесь дружны, старанны студэнцкі калектыў філфака. «Правучыць» такіх студэнтаў здымаючы стыпендыю — не зусім выхаваўчая мера. Тут больш актыўны ўдзел трэба прыняць грамадскасці групы і курса, а самім старастам быць прынцыповымі, таму што гэта больш за ўсё датычыцца іх ; ім-жа даручылі студэнты такі важны ўчастак дзейнасці.*

*Г. МАЦУК.*

# ЗАГЛЯНЕМ У АЎДЫТОРЫІ

ІДА СЁННЯШНЯГА дня прыпамінаецца радасць і хваляванне, калі я першы раз увайшоў ва універсітэцкую аўдыторыю, калі пісаў першую лекцыю за чыстай, прыгожа пафарбаванай лакам партай. Колькі думак вярцелася ў галаве! І аб клопатах Радзімы аб студэнтах, і аб тым, што ўсюды сустракае чысціня...

Студэнцкае жыццё з кожным днём станавілася ўсё больш і больш прывабным. Непрыкметна у напружанай працы праляцелі тры гады. Дзе падзеўся выгляд ранейшых парт, аўдыторый? Яны сталі шэрымі і нават... Але не будзем спяшацца. Давайце лепш заглянем у тую ж самую першую аўдыторыю, дзе я тры гады назад пісаў першую лекцыю. Майму здзіўленню няма межаў. Некаторыя парты нечым напамінаюць цэлыя старонкі розных рэклам, аб'яў, формул, задач. А аматары малявацъ заілюстравалі ўсё гэта рознымі фігурамі дзяўчат. Аднойчы на парце я налічыў каля 50 надпісаў і малюнкаў. Перад вачыма забегалі цёмныя кругі. Падумаць: хапала ж нейкаму студэнту часу нажом выразаць на парце вялізнымі літарамі: «Ала! Я цябе люблю!»...

А магчыма, што я сеў за тую парту, дзе сядзяць людзі, якія выпадкова трапілі ва універсітэт? Падаўся я да другой, але тое ж самае і там. Не лепшы выгляд мела і трэцяя, чацвёртая, дзесятая... Хто тут займаецца? Але на гэтае пытанне адказаць не так проста. Прасядзіць адна група дзве гадзіны, пасля на яе месца прыходзіць іншая і так далей. Таму цяжка выявіць, хто аўтар розных «клінапісаў».

Я запрасіў сваіх аднакурснікаў правесці «сацыялагічныя даследаванні» наконт культуры нашага рабочага месца. Падышлі да групы студэнтаў і пачалі гаворку пра парадак у аўдыторыі. А самі пільна прыглядаемся да кожнага і думаем: «На злодзею, як кажуць, шапка гарыць. Выдасць сябе сваімі паводзінамі той, што псуе парты, ці не?» І што вы сабе думаеце? Не было ніводнага студэнта, які б раўнадушна падыходзіў да гэтага пытання. Усе абураюча праклінаюць тых, хто займаецца шкодніцтвам. Дык хто ж тады робіць усё гэта? Можа вячэрнікі? Многія спрабуюць і даволі часта ўсе брудныя справы спіхваць на вячэрнікаў. Але спытайце ў іх саміх. Што адкажуць яны? Атрымліваецца, што мы таргуем сумленнем. Самі робім і клянём тых, хто робіць гэта.

Віктар Захарчук, старшыня прафбюро філфака, думаў купіць некалькі соцень сціральных гумак, зрабіць нядзельнік і вывесці ўсе плямы са сцен гуманітарнага корпуса. А ці ж прынясе гэта якуюнебудзь карысць? Будуць сцёрты плямы і малюнкі, а на іх месцы з'явяцца другія.

Карацей кажучы, ніхто не ведае, як ліквідаваць такое бескультур'е. Адзін Захарчук у полі не воін. Тут неабходны прынцыповы падыход да гэтай справы не толькі аднаго чалавека, але і ўсяго камсамольскага бюро курсаў і факультэта, усёй камсамольскай арганізацыі і дэканата. За беспарадак у сваёй аўдыторыі павінны несці адказнасць усе студэнты.

У даным выпадку вялася размова на фактах філалагічнага факультэта, але гэта не дае падставы гаварыць, што на іншых справы абстаяць значна лепш. Загляніце ў аўдыторыі да матэматыкаў, юрыстаў, фізікаў, там вы таксама ўбачыце нешта падобнае.

І сёння, калі ідзе гаворка пра культуру студэнта, нельга заставацца ў баку і абыякава адносіцца да тых, хто кідае на падлогу пашкамутаныя паперы, акуркі і ціха хіхікае сабе ў кулак «Ат, прыбіральшчыца ёсць, ёй грошы плоцяць...» Брыдка і непрыемна слухаць такое ў наш час і тым больш ад студэнтаў, з імем якіх звязана ўсё перадавое і прагрэсіўнае. На гэтым можна было б паставіць кропку. Але мне хочацца спыніцца вось яшчэ над чым. Пытанні ў артыкуле «Што значыць быць культурным?» дацэнт Е. Л. Бондарава паднімае вельмі важныя і хацелася б, каб спрэчка вялася не толькі на старонках газеты, а і ў групах, на курсах, факультэтах, каб кожны зразумеў яе сэнс і актуальнасць, зрабіў для сябе адпаведныя вывады.

Ю. АГАРАДНІЧЭНКА.




**Студэнты з нецярплівасцю чакаюць кожнай новай лекцыі, якую будзе чытаць дацэнт Соф'я Аляксееўна Лысенка. На здымку нашага фотакарэспандэнта А. Кадзета вы бачыце, як зачаравала яна будучых журналістаў глыбокім і шматгранным зместам тэмы. Не выпадкова, што на яе лекцыях пануе цішыня, а на практычных занятках—гарачыя спрэчкі.**



# ДВА ПАЛЮСЫ

У дзевятым нумары газеты «Беларускі універсітэт» быў змешчан артыкул дацэнта кафедры савецкай журналістыкі Е. Л. Бондаравай «Што значыць быць культурным?», з асноўнымі думкамі якога нельга не згадзіцца кожнаму студэнту, кожнаму савецкаму чалавеку. Па-мойму, сёння, калі стаім перад паверкай юбілейнага года, перад памяццю Вялікага Кастрычніка, праблема культуры і паводзін займае не менш важнае месца ў нашым паўсядзённым жыцці, чым іншыя.

Сапраўды, як гаварыў М. І. Калінін, паняцце культуры вельмі шырокае. А яе адмоўныя і дадатныя полюсы можна ўгледзець заўсёды і ўсюды: на лекцыі, у бібліятэцы, сталовай, інтэрнаце. Бывае і так: адзін ваш, здавалася б, нязначны рух і адно вашае слова ўжо могуць гаварыць аб многім. Паспрабуйце, зайдзіце ў кабінет дэкана, засунуўшы рукі ў кішэні. Ці стане вас хто-небудзь слухаць? Вы не прывіталіся са сваім знаёмым. Што скажа ён вам? Сказаць, можа, і не скажа, але падумае, што чалавек вы—бескультурны. І гэта ўжо вялікі мінус усім вашым паводзінам. Іменна з такіх, на першы погляд, невялікіх і нязначных недахопаў складаецца вялікае і значнае. І становіцца вельмі крыўдна, калі яшчэ сёння факты бескультурнасці сустракаюцца ў асяроддзі студэнтаў і. больш таго, перарастаюць у хуліганства, пастаянную неахайнасць і бестактоўнасць.

Аднойчы мне давялося пачуць не вельмі прыемную для нас, студэнтаў, размову дзвюх жанчын, якія ішлі па вуліцы Паркавая магістраль, недалёка ад універсітэцкага інтэрната № 4. Жанчыны, відаць, былі суседзямі і добра ведалі норавы некаторых нашых студэнтаў. Дык вось адна з іх і гаворыць другой:

— Паслухай, Міронаўна, давай лепш абыйдзем гэтым завулкам.

— Чаму? — пытае другая.

— Ды тут мне неяк страшнавата хадзіць. Аднаго разу я ішла вечарам з работы дадому якраз каля самага інтэрната, дык зверху перад маім носам праляцеў палаючы акурак, чуць на галаву не ўпаў. А то часамі магчыма і такое, што на вас з таго ж акна могуць плюхнуць вадой.

На жаль, факты гэтыя не выдуманы: такое бывае.

А хіба нельга яшчэ знайсці ў гэтым жа інтэрнаце студэнтаў, якія жывуць у брудных, засмечаных пакоях, якія любяць садзіцца на вокны ці на люстра ў калідоры? Можна. Хоць такіх людзей і нямнога, але яны ёсць. І іх трэба яшчэ выхоўваць, нягледзячы на тое, што яны і носяць імя студэнта.

Куды лепш гаварыць аб дадатным. Чаму б, да прыкладу, не ўспомніць аб «экіпажы» пакоя № 249 таго ж самага інтэрната. Тут заўсёды вас сустрэне чысціня і ўтульнасць, тут усё на сваім месцы. Жывуць у гэтым пакоі студэнткі філфака: Ларыса Краўчанка, Тамара Ціхановіч, Таня Буслава, Галя Дашкевіч, Лена Івахненка і Вера Крывашэева. Не здарма ўжо трэці месяц на іх стале стаіць радыёла—прыз на званне лепшага пакоя ў інтэрнаце.

Вось і атрымліваецца, што ў паняцце культуры ўваходзяць два полюсы, наяўнасць аднаго з якіх ніяк не жадана.

А. САКАЛОВІЧ.

Ва ўсім свеце з кожным днём нарастае гнеў і абурэнне да амерыканскіх імперыялістаў, якія пашыраюць небяспечную эскалацыю агрэсіі супраць свабодалюбівага в'етнамскага народа. Ва ўсім свеце расце салідарнасць і дапамога барацьбітам В'етнама. У нашай краіне на фабрыках, заводах, у калгасах, саўгасах, вышэйшых навучальных установах — паўсюдна прайшлі мітынгі пратэсту. Тыдзень салідарнасці з Паўднёвым В'етнамам з'явіўся яскравым сведкам таго, што савецкі народ назаўсёды застанецца поплеч з в'етнамскімі братамі, заўжды будзе аказваць яму неабходную дапамогу і ўсямерную падтрымку ў справядлівай барацьбе.

Днямі ў сценах нашага ардэнаноснага універсітэта таксама адбыўся шматтысячны мітынг салідарнасці з гераічным в'етнамскім народам. Студэнты, аспіранты, прафесарска-выкладчыцкі калектыў, супрацоўнікі і служачыя сабраліся сюды, каб выказаць пратэст і абурэнне агрэсіўным дзеянням Злучаных Штатаў Амерыкі і іх сатэлітаў у В'етнаме.

Мітынг у перапоўненай зале ўступным словам адкрывае сакратар парткома Тацяна Яфімаўна Дударава.

# ГНЕЎ І АБУРЭННЕ

— Пашырэнне эскалацыі амерыканскіх імперыялістаў у Паўднёвым В'етнаме, бамбардзіроўкі ДРВ выклікаюць трывогу і заклапочанасць народаў усяго свету, — гаворыць Тацяна Яфімаўна.

Яна расказала аб незвычайным патрыятызме і гераізме, стальной стойкасці в'етнамскіх барацьбітоў за незалежнасць і ўз'яднанне сваёй Радзімы, аб стваральнай працы гераічнага народа на шляху пабудовы сацыялізма, аб тым, што в'етнамцы ў сваёй барацьбе не адзінокія, на іх баку магутнасць Савецкага Саюза, сацыялістычнага лагеру, усяго прагрэсіўнага чалавецтва. У заключэнне прамоўца пад гучныя апладысменты прысутных заявіла:

— Студэнты, аспіранты, прафесарска-выкладчыцкі калектыў, супрацоўнікі і служачыя Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна патрабуюць неадкладнага вываду амерыканскіх войск і іх сатэлітаў з Паўднёвага В'етнама, спынення варварскіх бамбардзіровак ДРВ, строгага выканання Жэнеўскіх пагадненняў 1954 года па В'етнаму!

Прафесар універсітэта Васіль Аляксеявіч Дзяменц'еў, савецкія студэнты і дзеці шаснаццаці замежных краін, што навучаюцца ў нашым вну, у сваіх прамовах выказвалі гнеў да міжнароднага жандарма, душагуба свабоды і дэмакратыі — амерыканскага імперыялізму, заявілі аб сваёй гарачай падтрымцы і салідарнасці з мужнымі патрыётамі В'етнама.

Авацыі, гучныя апладысменты выклікалі ў прысутных словы студэнта V курса фізічнага факультэта універсітэта Нгуен Чонг Біня:

— Амерыканскі імперыялізм багаты доларамі, в'етнамскі народ — героямі. Таму наш народ не будзе пераможаны ніколі! Неўзабаве мы атрымаем дыпломы і вернемся на Радзіму. Цёплыя пачуцці савецкага народа да нас, стараннe і самаадданасць прафесарска-выкладчыцкага калектыву, студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна дзеля таго, каб мы былі высокакваліфікаванымі спецыялістамі, іх бацькоўскую шчырасць захаваем у сваіх сэрцах назаўсёды. Бо нельга ніколі забывацца на свайго брата, сястру, маці. Толькі такімі словамі можна назваць народы Савецкага Саюза, якія аказваюць усё больш адчувальную дапамогу В'етнаму ў яго справядлівай барацьбе з лютым агрэсарам.

— Таварышы, мы в'етнамцы, як адзін перакананы, што пераможам у справядлівай барацьбе!

У адзінагалосна прынятай рэзалюцыі калектыў ардэнаноснага універсітэта выразіў гнеўны пратэст супраць варварскіх бамбардзіровак ДРВ, патрабаваў неадкладнага вываду амерыканскіх войск і іх сатэлітаў з Паўднёвага В'етнама.

В. ІВАНОЎСКІ.



# ПАКУЛЬ СПЯЦЬ БАГІНІ...

Эрмітаж... Гэтае слова вельмі прыгожа гучыць. Многія тысячы людзей былі ў ім да нас, многія будуць пасля нас. Зусім нядаўна ў яго залах пабывалі мы—студэнты Беларускага ардэнаноснага універсітэта імя У. І. Леніна.

Па гэтай беламрамарнай лесвіцы я падымаюся ў шосты раз. Сюды прыходзіў раніцою ў зімовы і летні час, калі было сумна ці не ладкавалася жыццё. Толькі тут я доўга мог думаць аб людзях, аб сабе, аб будучым.

Студэнт БДУ Васіль Літвінка тут упершыню, яму я крыху зайздрошчу, таму што яму прадстаіць пазнаць тут столькі прыгожага. Кожная зала—цэлае адкрыццё. Ужо каля першай карціны Франчэска Фурыні «Андрамеда», ён спыніўся з глыбокімі разважаннямі. А дзяўчаты, якія ўваходзілі з намі адначасова, ужо былі ў трэцяй зале. Што ж, да свяшчэннага хвалявання перад мастацтвам кожны з нас прыходзіць сваім шляхам. І мне прыпомнілася маё першае наведванне Эрмітажа. Яго «адкрыў» мне мой старэнькі настаўнік Іван Васільевіч Качкан. Здаецца, тады за паўгадзіны я паспеў прабегчы амаль усе залы, а ён стаяў перад рафаэлеўскай «Мадоннай з дзіцём». Тады мне здавалася, што такая «адданасць» аднаму палатну проста недарэчна. За мінулае мне зараз крыху сорамна.

Вось і палатно Антоніса ван Дэйка «Апостал Пётр». Да гэтага карціна мяне цягне з маімі дзіцячымі, а потым і дарослымі ведамі, радасцямі і поспехамі. І менавіта, у гэтага палатна са мной здараецца нешта незвычайнае. Гэтая карціна выклікае да роздуму аб мэце жыцця, вучыць дабру, дапамагае пераадольваць гнеў. Нашы знаёмыя дзяўчаты, кінуўшы позіркам на гэтае палатно, заспяшаліся ў чарговую залу. Васіля ж прыйшлося сілком адцягваць ад гэтай карціны.

У залу «Разнога каменя» мы ўваходзім усёй нашай групай. Тут шмат статуй, антычнага свету. Таня, злёгку пачырванеўшая, пытаецца ў Васіля:



— Растлумач, каму трэба бачыць іх такімі?..

Бачу, юнак здзівіўся такому пытанню... Пачынае ёй даказваць, што людзі з яшчэ далёкіх часоў пакланяліся прыгажосці і стараліся ўвасобіць яе ў сваіх вобразах для многіх пакаленняў...

— А што, па—твойму, можа быць прыгажэй за чалавека?

Таня ўважліва слухае, але па выразе яе твару можна здагадацца, што думкі яе, відаць, засталіся пры сабе...

Васіль ужо проста злуе:

— Разумей жа, што людзей, якія стварылі гэтыя статуі даўно няма, але мы можам дзівіцца на прыгожае, іх вачыма ўспрымаць уяўленне аб прыгожым.

— Добра, можа гэта і прыгожа, але камень ёсць камень, а душы то няма,— гаворыць Таня.

А прыгледзьцеся сюды больш уважліва. Мы ўселіся каля фігуры багіні. Падсвечаная прамянямі сонца, яна здавалася пурпуровай. Мы ўсе вельмі залюбаваліся, і нават хацелася кранунь статую рукамі. Мастак прыклаў шмат намаганняў, каб стварыць рэалістычны вобраз, прыгожа і своеасабліва адлюстраваць кожную дэталь чалавечага цела. Нехта з дзяўчат прамовіў:

— Які талент! Якое багацце ўспрыймання жыцця антычнага свету!

Каля нас, размаўляючы і затрымліваючыся праходзілі групы турыстаў: спяшаліся, бо ім яшчэ ісці ды ісці па залах Эрмітажа. Мы сваё наведванне закончвалі. Назаўтра я вырашыў пайсці ў Эрмітаж адзін. Каб яшчэ раз з захапленнем прайсці і падзівіцца гэтай вялікай скарбонкай мастацтва, бо кожны раз, калі мне прыходзілася бываць тут, я пазнаваў нешта новае, што моцна ўразалася ў памяць, прымушала дзейнічаць, выклікала вялікую энергію і імкненне маладосці. І ў маёй галаве кожны раз, калі я зачыняў дзверы Эрмітажа, вілася думка: я шкадаваў, што не жыву дзе-небудзь тут, побач, каб кожны дзень захапляцца багацейшымі калекцыямі карцін выдатных мастакоў свету, архітэктурай самога Эрмітажа, разгонам яго беламрамарных лесвіц, статуямі, галерэямі...

А. Кадзет,
фота аўтара.

# ГОРКІ ЎРОК

Думаецца, што няма такога студэнта, які б не памятаў тыя хвалюючыя дні, калі ён здаваў уступныя экзамены на права быць студэнтам універсітэта. Гэтыя экзамены застануцца ў памяці на ўсё жыццё, бо цяжка прыгадаць іншы час, больш напружаны, патрабуючы многа энергіі, сілы і волі. Гэта перыяд, калі кожны абітурыент выкладае апошнія сілы, каб заваяваць «хоць адзін лішні бал», які можа вырашыць пытанне — «быць ці не быць».

Але вось конкурсныя экзамены засталіся ззаду, а ў кішэні ў цябе студэнцкі білет, ёсць ложак у інтэрнаце і нават стыпендыя. І цяпер у многіх студэнтаў знікае той запал, які панаваў на ўступных экзаменах. Цяпер тройка становіцца жаданай адзнакай.

Вынікі экзаменацыйнай зімовай сесіі на першым курсе геаграфічнага аддзялення геолага-геаграфічнага факультэта даволі сумныя. Палова ўсіх двоек, атрыманых у час сесіі ўсім факультэтам, прыпадае на іх долю (дакладней — 47). Многія атрымалі па дзве нездавальняючыя адзнакі, а такія студэнты, як Богуш, Скварцова і Забалотнікаў— па тры. Фініш у іх вучобе, як бачыце, больш чым сумны. Па загаду рэктара універсітэта гэтым людзям прыйшлося разлучыцца са званнем стдуэнта. Толькі са 125 чалавек, атрымаўшых здавальняючыя адзнакі, 32 на гэтым курсе здалі на «добра» і «выдатна». Чыстыя выдатнікі — толькі Новікава і Богдзель. Астатнія — троечнікі.

У чым жа справа? Чаму такія дрэнныя вынікі сесіі? З такімі пытаннямі мы звярнуліся да куратара адной з груп першага курса аспіранткі Л. А. Паўловіч. З яе расказаў і расказаў многіх іншых студэнтаў вынікае многае.

— Сесія стала сур'ёзным урокам для ўсіх студэнтаў першага курса. Асноўная бяда ў тым, што многія з іх пераацанілі свае сілы, дрэнна рыхтаваліся да экзаменаў. Яны думалі што пяці дзён дастаткова на падрыхтоўку да кожнага экзамена. Таму на працягу семестра на курсе панавала нейкая пасіўнасць, студэнты не сістэматычна рыхтаваліся да практычных заняткаў. Ды і вопыту падрыхтоўкі да экзамена ў вну ў іх не хапала...

Характэрным з'яўляецца выступленне студэнткі Скварцовай на камсамольскім сходзе чацвёртай групы, якая сама атрымала тры двойкі. «Галоўная прычына, якая прывяла мяне да такога няўдалага фінішу, — прызналася яна, — гэта мая безтурботнасць у адносінах да вучобы. Такая памылка для мяне застанецца на ўсё жыццё. Пастараюся больш не дапускаць яе».

Нельга не адзначыць і такі факт, што медалісты, якіх на курсе налічваецца больш 30, не былі прадстаўнікамі тых, хто паспяхова здаў сесію. Многія з іх атрымалі двойкі. Здавалася б, мінчане, якія маюць лепшыя ўмовы для вучобы, павінны былі таксама паказаць добрыя вынікі на экзаменах. Але атрымалася наадварот. Яны здалі сесію горш за іншагародніх.

Можна смела сказаць, што і камсамольскае бюро курса і камсоргі акадэмічных груп не прыдавалі належнай увагі пытанням вучобы. Барацьба за паспяховую вучобу не стала асноўнай у іх дзеянні. А камсорг чацвёртай групы Шакарышвілі нават сам атрымаў дзве нездавальняючыя адзнакі. Камсамольцам прыйшлося выбіраць другога кіраўніка.

Вучоба ва універсітэце значна адрозніваецца ад вучобы ў школе. Гэта добра адчулі першакурснікі, атрымаўшыя «горкі» урок на экзаменах. Вучоба—гэта такая ж штодзённая цяжкая праца, як і праца шахцёра, палявода, урача, і адносіцца да яе трэба з усёй сур'ёзнасцю.

Прайшоўшыя на першым курсе камсамольскія сходы, на якіх былі падведзены вынікі мінулай сесіі, высокая актыўнасць, якая там панавала, дае падставу гаварыць, што першакурснікі зрабілі правільныя вывады і не збіраюцца паўтараць дапушчаныя памылкі.

П. РОГАЧ.

# *На паэтычнай хвалі*

*Гэты літаратурны вечар па праву можна назваць справаздачай маладых паэтаў—студэнтаў перад сваімі таварышамі — чытачамі. Прыйшоўшыя ў мінулую суботу ў актавую залу гуманітарнага корпуса студэнты-філолагі, а таксама іх госці: студэнты юрыдычнага, матэматычнага факультэтаў нашага універсітэта, сябры з іншых навучальных устаноў горада з вялікай увагай слухалі новыя у большасці свае цікавыя вершы з вуснаў саміх аўтараў.*

*Адкрыўшы вечар, паэт Алег Лойка, кіраўнік універсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Узлёт», расказаў аб рабоце аб'яднання, пазнаёміў прысутных з творчымі планамі маладых паэтаў, паведаміў, якія дасягнуты ў гэтым поспехі.*

*У гэтым годзе выступае са сваім першым зборнікам член літаб'яднання Мар'ян Дукса. Да 50-годдзя Савецкай улады узлётаўцы выпусцяць сваю другую кніжку «Натхненне».*

*Радуюць сваімі новымі вершамі Алесь Разанаў, Яўгенія Янішчыц, Юрка Голуб.*



## СПРАВАЗДАЧА ПЕРАД ТАВАРЫШАМІ

*А потым узлётаўцы чыталі свае вершы. Выступіла 16 чалавек. З вялікай цікавасцю слухалі прысутныя вершы Льва Барташа, Віктара Дарашкевіча, Мар'яна Duксы, Уладзіміра Дзюбы, Сяргея Законнікава, Анатоля Казловіча і іншых.*

*Юрка Голуб прачытаў хлёсткія і вясёлыя літаратурныя эпіграмы на творчасць сваіх сяброў-узлётаўцаў.*

*Пазнаёміў са сваімі вершамі прысутных і Алег Антонавіч Лойка.*

*На развітанне студэнты выказвалі пажаданне, каб такія справаздачы маладых універсітэцкіх паэтаў праводзіліся часцей.*

*НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) перад прысутнымі выступае кіраўнік літаб'яднання паэт Алег Лойка; (унізе) уважліва слухаюць гаспадары і госці сваіх сяброў.*

*Р. ЛІСАЎ.*

*Фота В. ОЗЕРАВА.*



# У ГОРЫ ДАРОГА НЕ ПРОСТАЯ

**Юрка Голуб — студэнт другога курса філалагічнага факультэта нашага універсітэта. Ён член літаратурнага аб'яднання «Узлёт». Гэта хлопец не толькі з крылатым прозвішчам, але і з такімі ж крылатымі думкамі і марамі, якія ён стараецца ўвасабляць у паэтычнай форме. І трэба сказаць, што гэта яму ўдаецца не без поспеху. Юрку ўсяго дзевятнаццаць, а яго вершаваныя творы ўжо паспелі пабываць на старонках рэспубліканскіх газет і нават часопісаў.**

**Сёння мы аддаём на суд чытача некалькі яго новых вершаў.**



## ДАРОГА Ў БУДАПЕШТ

Іду да цябе начамі,
Такімі ж,
як два дзесяцігоддзі
назад,
поўнымі чакання...
Карпаты мне сцелюць
пасцель
з высокай хмарай
у галовах.
Толькі спаць не магу!

Дваццаць год
са сваёй старонкі
нясу я ваду
хлопцам —
вяскоўцам маім...
Яны і зараз ляжаць
З губамі сухімі
на цэгле балючай, бітай
побач з чырвоным
Дунаем...
Я іду ў Будапешт...

* * *

**Калі не пішуцца вершы,
Ты прыходзь да мяне,
У маю леснічоўку,
Што засела па пояс
У цаліку.
Абтросшы вушанку,
Павесіш пад белую
бэльку.
Леснічоўка пазнае цябе
і выкруціць кнот,
нагарэлы, як месяц
стары.
Мы пасядзем удвух
на ўслонак шурпаты.
Вып'ем чаю,
ці знойдзецца можа
мацней...
Закусім гурком,
навылёт перамёрзлым
салам.
Пагаворым пра Лорку,
Пачытаем напамяць яго
і далёкага Пабла
Неруду.
Пра дзяўчат гаварыўшы,
заснём...
Калі не пішуцца вершы,
Ты прыходзь да мяне,
у маю леснічоўку,
Што выкручвае кнот,
Нагарэлы, як месяц
стары.**

## ЧЫРВОНЫЯ СЛЯДЫ

Аленю нагу ўначы
(Бачу, нібы ў паданні)
Застрэмленую на карчы
Аляніца грэе дыханнем!

А ён слухае цішыню,
Паварушваючы рагамі,
І не зможа ўпершыню
Стаяць чатырма нагамі!
А дзесь кволыя капыткі
Зграя ваўкоў вынюхвае.
Толькі шоргаюць камякі
Пад кіпцюрамі глуха.
Травы пачуюць роў —

І падаюць на калені!..
А раніцай успыхне
мурог
На слядах
апошніх аленевых...

* * *

**У горы дарога не
простая —
Слізгане у абрыў
сцяга...
Снегам,
нібы на просціне,
За сабою тугу цягаць.**

**А стромы,
Як катапульты!
Вынесе ў вышыню!
На чорнай зямлі
пакутваць
Бяскрылым не
ўпершыню...**

## ВАРТАЎНІЦА САДУ

Бацька быў скупы
садоўнік,
Ды занядужаў ён ужо.
Дачку адправіў ноччу
з дому
І даў для смеласці
ружжо!

Яна з ружжом!
Ну проста смешна!
Пераскокваў я праз
плот.
Стары сябе ў пасцелі
цешыў:
Дачка ўпільнуе кожны
плод.

Няхай пацешыцца
ў спакоі,
Калі засне і сад, і дом...
Я не спалохаюся зброі
І вартаўніцы маладой!

І не пачуе бацька.
Толькі
рвануцца грудзі, нібы
тол!
Спаўзе павольна
дубальтоўка
з рукі дзявочае на дол...

# СПОРТ

## НА ФІНІШЫ—МАЦНЕЙШЫЯ

На закончаным першынстве універсітэта па баскетболу ў мужчын чэмпіёнам стала каманда фізічнага факультэта. Сустрэча фізікаў з мінулагоднім чэмпіёнам, камандай матфака, адбывалася пры ўпартай барацьбе. Лідэр не здаваўся, а фізікі кінулі ўсе сілы на тое, каб дабіцца перамогі. Упартасць, вынослівасць і агрэсіўнасць у нападзенні прынесла камандзе фізікаў перамогу. Ітак, яны сталі чэмпіёнамі універсітэта 1967 года па баскетболу.

Змена лідэраў універсітэта адбылася не толькі ў мужчын, але і ў дзяўчат. Тут першынство атрымала каманда гістарычнага факультэта. Гісторыкі перамаглі сваіх сапернікаў, каманду фізфака, з лікам 50:37. Упартае супраціўленне чэмпіёнкам аказалі баскетбалісткі філфака, якія прайгралі ім 12 ачкоў.

У мужчын наступныя месцы занялі: гістарычны, хімічны, біялагічны, юрыдычны, філалагічны факультэты. А сярод жаночых месцы размясціліся наступным чынам: хімфак, філфак, матфак, біяфак, геолага-геаграфічны.

Каманды геолага-геаграфічнага факультэта ў мужчын і юрыдычнага ў жанчын зняты са спаборніцтваў з-за малой колькасці ігракоў.

**А. АСТАПАЎ.**

## ПАСПЯХОВЫ ДЭБЮТ

**Каманда валейбалістаў нашага універсітэта адкрыла першы тур клубнага першынства г. Мінска па валейболу. Спаборніцтвы першага круга будуць праходзіць у сакавіку—красавіку. Кожны клуб выстаўляе па шэсць каманд, куды ўваходзяць жаночыя і мужчынскія зборныя, дзве маладзёжныя дзяўчат і юнакоў, узрост якіх не больш 20 год і дзве дзіцячыя каманды.**

**Жаночы клуб БДУ ўжо правёў дзве сустрэчы і ў абедзвюх дабіўся перамогі. У першай гульні нашымі сапернікамі была каманда Інстытута народнай гаспадаркі. Усе тры каманды універсітэта атрымалі перамогу: дзіцячая з лікам 3:2. маладзёжная — 3:0 і зборная жанчын— 3:1.**

**У сустрэчы мужчынскіх каманд гэтых клубаў дзіцячая каманда прайграла, а маладзёжная і зборная атрымалі перамогі.**

**Асабліва напружанай была барацьба ў сустрэчы зборных жаночых каманд БДУ і «Фінала». Калі дзіцячая і маладзёжная каманды нашага клуба даказалі сваю перавагу ў трох партыях, то зборная жанчын толькі ў пятай партыі атрымала перамогу.**

**Спаборніцтвы працягваюцца.**

**М. КУЧЫНСКІ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**



*Першакурснік матфака Ігар Соўпель—першаразраднік, член зборнай каманды лёгкаатлетаў універсітэта і юнацкай зборнай БССР па кіданню молата.*

*Фота А. Кадзета.*

**Рэдактар М. І. ЮСЬКА.**

**Калектыў супрацоўнікаў падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніку падрыхтоўчага факультэта універсітэта Лучанку Раману Пракоф'евічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці жонкі.**

АТ. 16839. Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 666.